# У хакей гуляюць сапраўдныя мужчыны!

19 студзеня ў Сусветны дзень снегу на лядовай пляцоўцы, што каля ДЮСШ, прайшоў адкрыты раённы турнір па хакеі “Залатая шайба”. Дзве каманды з Орлі (старэйшы і малодшы састаў) і Шчучынская зборная каманда змагаліся за перамогу.



Юныя хакеісты з Орлі і на гэты раз праявілі сябе. Увогуле гэтыя рабяты неаднаразова станавіліся прызёрамі абласных спаборніцтваў “Залатая шайба”, прымалі ўдзел і ў рэспубліканскім турніры. Старалася і зборная каманда са Шчучына. Спартсмены паказалі сапраўды цікавую і яркую гульню. У выніку з лікам 3:4 перамаглі орлеўскія хакеісты.

– Я першы раз стаў на канькі ў 5 гадоў, — гаворыць капітан малодшага саставу орлеўцаў Аляксандр Дубок. — Разам з трэнерам У.У. Хэлскім мы вельмі шмат працуем над сабой. Зімой не выпускаем клюшку з рук, таму і паказваем добрыя рэзультаты!

Пад стук клюшак, а менавіта так “апладзіруюць” хакеісты, першы сакратар РК БРСМ Алена Богдзель уручыла пераможцам і лепшым ігракам салодкія прызы.